Будзь у курсе!

# З 8 СНЕЖНЯ — ЗІМОВЫ ГРАФІК РУХУ ЦЯГНІКОЎ

**Новы графік руху цягнікоў на дарогах краін Садружнасці і Балтыі на 2019/2020 год пачне дзейнічаць з 0.00 гадзін 8 снежня, у краінах Заходняй Еўропы — з 0.00 гадзін 15 снежня.**




Па тэрыторыі Беларусі графікам прадугледжана курсіраванне 59 пар цягнікоў міжнародных ліній, 19 пар цягнікоў міжрэгіянальных ліній бізнес-класа, 42 пар цягнікоў міжрэгіянальных ліній эканом-класа, 14 пар цягнікоў рэгіянальных ліній бізнес-класа, а таксама 342 пар цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа і 33 пар цягнікоў гарадскіх ліній. Новы графік складзены з улікам патрэбы ў перавозках у названы перыяд, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.

У міжнародных маршрутах захаваны памеры руху цягнікоў на асноўных пасажыраўтваральных напрамках з Расіяй, Украінай, Літвой і Латвіяй, Казахстанам, Малдовай і краінамі Еўрасаюза.

Ва ўзаемадзеянні з чыгуначнымі адміністрацыямі Чэхіі і Польшчы з 15 снежня пашырана маршрутная сетка перасадачных і ўзгодненых цягнікоў у зносінах Варшава — Брэст — Мінск і адкрыты новы перасадачны маршрут Прага — Варшава — Брэст — Мінск.

Так, новы цягнік № 126 Варшава — Брэст будзе адпраўляцца са станцыі Варшава-Цэнтральная ў 13.10 і прыбываць на станцыю Брэст-Цэнтральны ў 19.10. Са станцыі Брэст-Цэнтральны цягнік № 125 Брэст — Варшава будзе адпраўляцца ў 19.56 і прыбываць на станцыю Варшава ў 22.15. Для перасадкі пасажыраў, якія накіроўваюцца да станцыі Мінск-Пасажырскі і назад, прадугледжана курсіраванне ўзгодненага цягніка № 726 Брэст — Мінск адпраўленнем са станцыі Брэст-Цэнтральны ў 20.00 і прыбыццём на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 23.25. Са станцыі Мінск-Пасажырскі цягнік № 725 Мінск — Брэст будзе адпраўляцца ў 15.59 і прыбываць на станцыю Брэст-Цэнтральны ў 19.01.

Новы цягнік № 136 Прага — Варшава — Брэст будзе адпраўляцца з Прагі ў 10.23 пад № 115 і прыбываць на станцыю Брэст-Цэнтральны ў 0.37. З Брэста цягнік № 137 будзе адпраўляцца ў 7.11 і прыбываць на станцыю Прага-Галоўная ў 17.39 пад № 114.

Цягнік Прага — Варшава — Брэст будзе ісці праз станцыі Острава-Галоўная (Чэхія), Катавіцэ, Варшава-Цэнтральная, Цярэспаль (Польшча).

Для пасажыраў цягнікоў № 136/137 Прага — Варшава — Брэст прадугледжана магчымасць перасадкі на станцыі Брэст-Цэнтральны на цягнік № 96 Брэст — Масква і з цягніка № 27 Масква — Брэст. Цягнік № 96 Брэст — Масква будзе адпраўляцца са станцыі Брэст-Цэнтральны ў 1.10 і прыбываць на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 6.18. Са станцыі Мінск-Пасажырскі цягнік № 27 будзе адпраўляцца ў 0.30 і прыбываць на станцыю Брэст-Цэнтральны ў 5.47. У саставе цягнікоў № 136/137 Прага — Варшава — Брэст таксама прадугледжаны штодзённыя беспperасадачныя вагоны Масква — Прага.

Цягнікі № 126/125 і № 136/137 будуць абслугоўвацца вагонамі лакаматыўнай цягі.

Таксама з уводам новага графіка руху цягнікоў на 2019/2020 год аптымізавана схема курсіравання цягнікоў па маршруце Гродна — Мінск — Масква, прадугледжана курсіраванне штодзённага двухгрупнага цягніка № 26/25 Гродна — Мінск — Масква, шэраг цягнікоў на напрамку Брэст — Мінск — Масква выведзены з абарачэння з улікам ацэнкі эфектыўнасці іх работы і аптымізацыі раскладаў.

У рамках узаемадзеяння з суседнімі рэгіёнамі і ў мэтах пашырэння і ўмацавання транспартных сувязяў Беларускай чыгункай арганізавана штодзённае курсіраванне дзвюх пар цягнікоў па маршруце Гомель — Навазыбкаў у ранішні і вячэрні час.

У міжрэгіянальных зносінах з улікам паступлення на Беларускую чыгунку сучаснага рухомага саставу з 8 снежня арганізавана курсіраванне трох пар цягнікоў міжрэгіянальных ліній бізнес-класа ДП6 па маршруце Мінск — Віцебск.

З улікам попыту на перавозкі і ў мэтах павышэння эфектыўнасці выкарыстання сучаснага рухомага саставу маршруты цягнікоў рэгіянальных ліній бізнес-класа Мінск — Баранавічы падоўжаны да станцыі Брэст-Цэнтральны праз станцыю Баранавічы-Палескія, пераведзены ў катэгорыю міжрэгіянальных ліній бізнес-класа. Такім чынам, гэтыя дзве пары цягнікоў будуць курсіраваць кожныя суткі па маршруце Мінск — Брэст.

Пашырана схема рэгіянальнага курсіравання ў Гомельскай вобласці — за кошт новых паскораных цягнікоў рэгіянальных ліній па маршрутах Рагачоў — Гомель, Рэчыца — Гомель, Гомель — Добруш.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# ЗІМА ПАЧЫНАЕЦЦА З АДЛІГІ

## З серады мокры снег будзе паступова пераходзіць у дождж

**Калі ў першых чыслах снежня ў краіне трымаўся слабы мароз, то ў сярэдзіне тыдня надвор'е пачне мяняцца. У гэтыя дні тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам атмасферных франтоў і цёплых паветраных мас, якія паступаюць з Заходняй Еўропы. Тэмпературны фон пачне павышацца, чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу, які пераходзіць у дождж, месцамі туман і галалёд, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А наогул на гэтым тыдні чакаецца няўстойлівае надвор'е. У аўторак удзень па паўднёвым усходзе краіны снег, слабая завіруха. Месцамі галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. У сераду ўначы месцамі, пераважна па паўночна-заходняй частцы Беларусі, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж. Месцамі туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература ўноч на сераду будзе ад мінус 2 да мінус 8 градусаў марозу, удзень чакаецца ад мінус 1 да 5 з плюсам.

Невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу чакаюцца ў асобных раёнах у чацвер. Месцамі туман, слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а ўдзень будзе ад нуля да 5 цяпла. У пятніцу чакаецца без істотных ападкаў, толькі ў асобных раёнах на паўночным усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дождж і мокры снег. Месцамі туман, уначы і раніцай слабы галалёд. У начны час тэмпература паветра будзе апускацца да мінус 5 градусаў, удзень чакаецца ад мінус 1 градуса да 5 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Найлепшыя

# З ГАНАРОВАЙ АДЗНАКАЙ

**У канцы мінулага тыдня ў Магілёве вызначылі найлепшых участковых інспектараў міліцыі і найлепшых участковых інспектараў па справах непаўналетніх. Агляд-конкурс праходзіць штогод і традыцыйна збірае сем камандаў — з кожнай вобласці і Мінска. 42 інспектары спаборнічалі за перамогу на працягу трох дзён. Выпрабаванняў было шмат — страявая, агнявая, тактыка-спецыяльная падрыхтоўка, аратарскае майстэрства, іспыты па медыцынскай і фізічнай падрыхтоўцы.**



Фота Алены ІГНАТАВАЙ.

У камандным заліку сярод інспектараў ІСН першае месца — у Гродзенскай вобласці. У асабістым заліку перамог старшы ўчастковы інспектар ІСН аддзела ўнутраных спраў Віцебскага райвыканкама Аляксей Саўчанка. А найлепшым участковым інспектарам міліцыі стала Настасся Чупрыс з Мінска. Сталічная каманда здабыла вікторыю і ў камандный намінацыі. Пераможцы атрымалі ключы ад новых службовых аўтамабіляў і сертыфікат на камп'ютарную тэхніку.

Намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі генерал-маёр міліцыі Мікалай Мельчанка ўручыў таксама і дыпломы прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі за найлепшую публікацыю аб дзейнасці ўчастковых інспектараў міліцыі і ўчастковых інспектараў па справах непаўналетніх. Сярод узнагароджаных — вядучы рэдактар аддзела камп'ютарных сістэм і інтэрнэт-версіі нашага выдавецкага дома Кацярына Ахрыменка. Віншуем!

**Ул. інф.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Борыс Джонсан выступае супраць датэрміновага вызвалення тэрарыстаў




74 чалавекі, раней асуджаных па звязаных з тэрарызмам артыкулах брытанскага заканадаўства, былі вызвалены ўмоўна-датэрмінова і цяпер знаходзяцца на волі. Сярод іх быў і 28-гадовы Усман Хан, што здзейсніў у мінулую пятніцу тэракт на Лонданскім мосце, у выніку якога загінулі двое і пацярпелі трое чалавек. Як заявіў прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан у эфіры тэлеканала Sky News, каментуючы сітуацыю, датэрміновы вызваленні тэрарыстаў недапушчальныя. Усман Хан у 2012 годзе быў асуджаны на 16 гадоў турмы за тэрарызм — ён спрабаваў падарваць напярэдадні Каляд 2010 года Лонданскую фондавую біржу, Біг-Бэн і Вестмінстэрскае абацтва, а таксама атакаваць Борыса Джонсана, які тады быў мэрам Лондана. Але ў снежні 2018 года, пасля адбыцця паловы прызначанага тэрміну зняволення, яго выпусцілі з-пад варты ўмоўна-датэрмінова з абавязацельствам насіць электронны бранзалет. У інтэрв'ю ў нядзельнай праграме BBC «Шоу Эндру Мара» Джонсан заявіў, што Хан змог атрымаць УДВ аўтаматычна, нават без заключэння камісіі па ўмоўна-датэрміновым вызваленні. «Мы ўвядзём больш строгія пакаранні за гвалтоўныя і сэксуальныя злачынствы, а таксама за тэрарызм, — абвясціў прэм'ер. — Я лічу недапушчальным тое, што гэты чалавек знаходзіўся на волі».

## У Кітаі ўводзяць абавязковае сканіраванне твараў карыстальнікаў смартфонаў

З пачатку снежня жыхарам Кітая для падключэння новых мабільных сэрвісаў спатрэбіцца прасканіраваць свае твары. Аб маючым адбыцца нававядзенні было абвешчана ў верасні. Па словах уладаў, гэта робіцца для абароны законных правоў і інтарэсаў грамадзян у кіберпрасторы. Улады КНР шмат гадоў паслядоўна змагаюцца з ананімным выкарыстаннем інтэрнэту. Для атрымання мабільнага нумара і раней патрабавалася пасведчанне асобы з фатаграфіяй (як гэта робіцца ў многіх краінах). Цяпер прад'яўленае фота будуць параўноўваць са сканіраваным тварам, каб дакладна



ідэнтыфікаваць чалавека і пераканацца, што ўсе карыстальнікі прысутнічаюць у сетцы пад сваімі сапраўднымі імёнамі. Нагадаем, што ў 2017 годзе быў прыняты закон, паводле якога інтэрнэт-платформы абавязалі правяраць асобу карыстальнікаў перад размяшчэннем іх кантэнту. Новае правіла, на думку міністэрства прамысловасці і інфармацыі, прызначана ўзмацніць гэтую сістэму. Колькасць інтэрнэт-карыстальнікаў у Кітаі вымяраецца сотнямі мільёнаў. Большасць з іх уваходзіць у сетку праз мабільныя тэлефоны. Урад шырока выкарыстоўвае відэаназіранне і розныя тэхналогіі распазнання людзей па тварах для кантролю. Кітай лічыцца сусветным лідарам у гэтай галіне.

## За два дні амерыканцы патрацілі на анлайн-пакупкі рэкордныя 11,6 мільярда долараў



Жыхары ЗША выдаткавалі рэкордныя 7,4 мільярда долараў на пакупкі ў інтэрнэт-крамах у «чорную пятніцу» — час буйных распродажаў. А напярэдадні — у чацвер, падчас Дня падзякі — таксама ўстаноўлены рэкорд — 4,2 мільярда. Паказчыкі «чорнай пятніцы» 2019-га больш чым на мільярд перавысілі леташнія, калі амерыканцы патрацілі толькі 6,2 мільярда долараў, паведамляе CNN. Сёлета ўстаноўлены рэкорд і на куплі, здзейсненыя з дапамогай смартфонаў, — каля 2,9 мільярда долараў, што на 900 мільёнаў вышэй, чым летась. І гэта зусім не мяжа спажывецкага гіпербуму. Аналітыкі спрагназавалі, што падчас «кіберпанядзелка» амерыканцы зробяць пакупак яшчэ на 9,4 мільярда долараў. Такім чынам, на працягу трох дзён «назбіраецца» 21 мільярд! Як вядома, тэрмін «чорная пятніца» ўпершыню быў выкарыстаны пры апісанні біржавай панікі 1869 года, а ў сучасным значэнні яго пачалі выкарыстоўваць у 1950-х для апісання аўтамабільных затораў, якія ўзнікалі ў гэты дзень каля гандлёвых цэнтраў, нагадвае ТАСС.